НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostro bramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 800 мк., сярод тэксту 600 мк. і на 4 стрніцы 400 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 10 **Нядзеля 6-га траўня 1923 г.** **Год I.**

Без зямлі і волі.

Ад веку мы спалі і нас разбудзілі,
Мы знаем, што трэба рабіць.
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку...
(Беларуская марсельеза).

Знаходзючыся на ўзьмежжу Захада і Усхода Беларускі Край, як ніякі іншы перанёс цяжар гістарычных завірух. Хто толькі не таптаўся на яго нівах, хто ня грабіў яго культурных і прыродных багацтваў, каму ён ня быў паднявольным рабом.

Беларускі селянін у працягу доўгіх пакутных вякоў як бы прывык да ярма нядолі, спакарнеў. Не жальбаваў ён нікому аб сваім горы, бо некаму было, ня меў ані прыяцеляў, ані абаронцаў: усё пераажываў ціханька ў сабе, у сваей хаце. Хто, калі ня ён, пяе пра гора: „мусіць трэба было“, а гутарку пераплятае пагаворкамі: Бог-бацька, будзем жыць, як набяжыць, дзень пераажыў і дзякуй Богу і т. д.

Для ўсіх чужынцаў беларускі селянін прадстаўляўся пакорным рабачаем, прастадушным „мужичком“ ці „kmiotkiem“, падаючым надзею на лёгкую асыміляцыю і беспраціўную эксплёатацыю яго працы.

Не дарма п. Скульскі (быўшы польскі міністар) сказаў, што праз 50 гадоў беларусаў ня будзе—апалячацца. Аднак гэты самы Скульскі ў часе выбараў дазнаўся на сваей скуры, што беларускі селянін больш жывучы, як яму выдавалася.

А ў апошнія часы усё часьцей-гусьцей чуваць аб так званых на афіцыяльнай мове „бандытах“, якія там двор панскі спалілі, там ліхога пана забілі. Паявіліся Мухі, Скамарохі, Чорты. А як кажа акт абвінавачаньня падсудных у Беластоцкім працэсе, дык была цэлая паўстаньчая арганізацыя, ставіўшая на мэце вызваленьне Беларусі.

Цяпер можна сабе прадставіць той веліч нацыянальнага і соцыяльнага уціску над беларускім селянінам!

Няма зямлі і волі.

Нашыя вёскі заўсёгды стагналі ад недахвату зямлі. У былыя часы той — іншы мог праз банк ці выплату дакупіць шматок зямліцы і так мадзелі з году ў год. Але вось вайна зруйнавала гаспадарку селяніна, а сямья павялічылася і ёсьць лішні рот — інваліды. Ясна, што не да куплі тут зямлі, ды ўрэшце, каб хто і змог купіць, дык абшарнікі такія патрыоты, што не прадаюць за маркі. а толькі на золата і доляры.

Замест нашумеўшай зямельнай рэформы маем балючую скулу асадніцтва. Пры гэтым асаднікі-палякі надзеляюцца ня толькі дворнай зямлёй, але і сялянскай, як, напрыклад, сэрвітуты.

За два мінуўшыя гады было надзелена 323000 гэктараў зямлі, якіх на мясцовае насяленьне прыпала усяго толькі 8000 гэкт. Надзяляюцца пераважна афіцэры, якія нічога супольнага ня маюць з сельскай гаспадаркай і зямля альбо пустуе, альбо беззямельныя ці малазямельныя змушаны браць пад высокую арэнду.

Для прыкладу возьмем Віленск. павет. На 64 надзелы ў павеце толькі тры атрымалі жаўнеры, 45 — атрымалі афіцэры ад харунжага да генарала ўключна, а рэшта сёстры міласэрдзя, пісары і інш.

Надзелы з найлепшай зямлёй атрымалі быўшы начальнік штабу ппал. Ліхтаровіч, кіраўнік рэфарату вайск. асадн. паруч. Дэраш і яго сваяк плют. Козело.

Шмат хто з надзеленых афіцэраў мае свае маёнткі дамы ў Вільні і інш. Вось яны гэта і ўваходзяць у лік тых, атрымаўшых 8000 гэкт. так наз. „мясцовага“ насяленьня.

З гэтага мы бачым, што асадніцтва мае не культурна-гаспадарскія мэты, як гэта часта пяюць, але палітычныя—і іменна палянізацыю.

І так зямлі няма.

Няма і волі. (Маючы на увазе пагрозу канфіскаты, разважаньні аб волі ня друкуем.—Рэдакцыя).

Р. Юргілевіч.

Палітычныя падзеі.

Рурскі басэйн. Становішча рабочых у акупаваных районах надта цяжкае. Паміма рэпрэсый акупацыйных уладаў, расьце дарагавізна і безработьце; закрываюцца прадпрыемствы і на вуліцу вікідаюцца новыя масы безработных. Ясна, што варожыя акупацыйныя ўлады нічым не дапамагаюць цяжкаму становішчу рабочых, увесь цяжар дапамогі падае на мяйсцовае грамадзянства, якое хоць і добра зарганізавана, але ўсеж-такі ня можа справіцца з непасільнай задачай. Арганізуюцца ў шырокім маштабе публічныя работы, але гэта ня можа даць працы ўсім безработным. Звальняемым выдаюцца пасьведчаньні, ў якіх гаворыцца, што звольнены з прычын атсутнасьці працы, вызванай акупацыяй, якое дае права да атрыманьня грашовай дапамогі. Безработныя арганізавалі ў Дюйсбургу дэманстрацыі, якія не абышліся без зачэпак з бельгійскімі вайскамі. Яшчэ большыя беспарадкі з прычыны безработьця адбыліся ў Мюльгэйме, Эссэне дзе шмат рабочых забіта і ранена.

Нямеччына. Урад Нямеччыны выслаў да ўрадаў саюзных дзяржаў і Злучаных Штатаў ноту, ў якой прапануе начаць перагаворы аб разьмеры рэпарацыйных сплат, пры гэтым немцы не адмаўляюцца ад свайго цяперашняга становішча пасыўнага спраціву, пакуль ня будуць эвакуаваны ўсе непраўна акупаваныя абшары. Немцы згаджаюцца на выплату 30 мільярдаў марак у золаце ў тэрміне да 1 ліпня 1931 году. Калі-б саюзьнікі не згаджаліся на гэтыя варункі, ўрад Нямеччыны прапануе перадаць справу міжнароднай камісіі, вольнай ад якіх-небудзь палітычных уплываў.

Францыя. Рада Міністраў адкінула нямецкія прапазыцыі, лічучы сумму 30 мельярдаў за недастатачную.

Англія. Шал далейшых вааружэньняў не пакідае капіталістычныя дзяржавы. Ангельская палата гмін прыняла, ўрадовы праэкт аб збудаваньні першараднай марской крэпасьці ў Сінгапуры якая будзе служыць базай для марскіх апэрацый на Далёкім Усходзе.

Польшча. Польскія газэты запоўнены адчотамі урачыстасьцей у часьць французскага маршалка Фоша, прыезду якога прыдаюць вялікае палітычнае і ваеннае значэньне.

У часе першамайскіх сьвяткаваньняў не абышлося без нападаў „хьенскіх нацыяналістаў“ на работнікаў. Былі выпадкі, калі паліцыя разганяла маніфэстантаў.

На жалезнадарожнай лініі Вільня-Турмонт нявыкрытымі асобамі узарваны два масты паміж Падбродзьдзем і Нова Сьвянцянамі і паміж Н.-Сьвянцянамі і Ігналінам.

Нацыянальнае пытаньне на камуністычным зьезьде у Маскве.

Рэзалюцыя зьезьду па нацыянальнаму пытаньню дамагаецца роўных праў аддзельных рэспублік, утварэньня спэцыяльнага органу – прадстаўніцтва ўсіх рэспублік і аўтаномных краін на парытэтных падставах, удзяленьня рэспублікам шырокіх фінансовых і бюджэтных праў, канструіраваньня органаў рэспублік із мяйсцовых людзей, якія знаюць мову і звычаі гэтых краёў, забесьпячэньнне правоў роднай мовы ўсіх дзяржаў, усіленьне ўзгадаваўчай працы сярод чырвонай арміі ў духу брацтва і салідарнасьці народаў.

Як ратавацца?

Цяперашні польскі старшыня міністраў Сікорскі ў часе апошняга свайго прабываньня ў найбольшым прамысловым месьце Польшчы, Лодзі, бяседаваў з прадстаўнікамі вялікіх фабрыкантаў. Спадзяваўся, што можа хоць яны задаволены. Нікому другому, як гэтым фабрыкантам Польшча старалася, як найбольш, дагадзіць. Сто семдзесят мільярдаў пазычыў дзяржаўны польскі скарб фабрыкантам. Паміма гэтага фабрыканты не здаволены і наракаюць. Яны скардзяцца, што 1) спадак польскай маркі, 2) кароткі, бо толькі 8 гадзінны дзень працы, 3) платныя отпускі для работнікаў, 4) высокія складкі, якія яны павінны ўносіць за работнікаў да работніцкай касы хворых і 5) праэктуемы падатак ад грашовага абароту пацягне за сабою упадак іхных фабрык, так, што яны наогул нічога ня змогуць вывозіць на продаж да чужых краёў. Вось як наракаюць капіталісты. Выходзіць, што не памаглі і пазычкі. Усё прапала ў іх кішані і жывацё. А пазычкі ідуць зўсяго на сяленьня, якое плаціць падаткі. З гэтага вынікаюць дзьве магчымасьці: „альбо запраўды ня ўмеюць гаспадараваць, альбо проста хочуць выдурыць для сябя далейшыя дапамогі і дзеля гэтага наракаюць. І ў першым і ў другім выпадку належала-б ім гэтыя фабрыкі адабраць. Зразумела, што такі выхад з палажэньня не магчымы ў капіталістычнай дзяржаве, ў якой закон стаіць на абароне іх прыватнай уласнасьці.

Польшча хоча далей папраўляць сваю валюту. Яна прымушана будзе падтрымліваць і далей вялікую прамысловасьць. Грошы з падаткаў будуць і далей плысьці ў кішаню ўласьнікаў фабрык. А малым яны не здаволяцца.

Мы мусім пра ўсё гэта пісаць і гэтым цікавіцца, бо панаволі знаходзячыся пад аднэй страхою з гэтымі капіталістамі мусім на сабе пераносіць усе наследствы гаспадарчай палітыкі Польшчы. Мы павінны знаць, куды дзяецца праца нашых працоўных мас. Польскі ўрад ані думае над паляпшэньнем іх долі. Ён знае гэтыя масы толькі тады, калі пасылае карныя экспэдыцыі, (што гэта так, даказывае інтэрпеляцыя жыдоўскіх паслоў у Сойме!) калі сьпягівае падаткі, альбо бярэ да войска. Становішча нашага сялянства пагоршываецца з кожным днём і ня будзе мець магчымасьці з прычыны абядненьня ўтрымліваць свае гаспадаркі на належнай вышыні. Мёртвы інвэнтар псуецца і няма за што купіць новы. Польскі ўрад дапамагае толькі польскаму сялянству. І то толькі таму сялянству, якое асаджываецца на ўсходзе. Недаўна Сойм ухваліл 50 мільярдаў для тых польскіх сялян-каланістаў, якія хочуць ехаць на крэсы. Такую „дапамогу“ нічым ня можна апраўдаць.

Наш сэлянін павінен прыглянуцца да сваей бяды, пакуль яшчэ час. Сучаснае гаспадараваньне, якое адбіваецца на яго кішані, маемасьці і здароўю ня зьменіцца само сабою. Трэба гатавацца да доўгае і зацяжнае барацьбы. Трэба клікаць да арганізацыі і крычаць так галосна, каб кожны несьвядомы бядак, пачуў гэты крык і зразумеў, як трэба змагацца. Польскія эндэкі высунулі кліч, каб ні адна пядзя зямлі польскага ўласьніка ня мягла перайсьці ў рукі селяніна другой нацыянальнасьці. Яны зарганізаваліся і цягнуць да сваей арганізацыі ўсё польскае грамадзянства, ўсё польскае сялянства. А наш селянін, нават у болей сьвядомых вёсках, памагае ім крунцць пятлю на сваю шыю. Нашым клічам мусіць стаць: ні адна пядзя нашае зямлі не павінна перайсьці ў чужыя рукі, ні аднаго грошa на дапамогу капіталістам і абшарнікам!

„Гр. Г.“

СУЛІМА.

Беларускі клюб у Польскім Сойме

(Глядз. № 9)

Беларускі народ, згодна з новым разуменьнем гаспадарства, разуменьнем, якое ня робіць з гаспадарства ідала Малёха, апраўдывае яго правы на істнаваньне пастолькі, пасколькі яно служыць народнаму дабрабыту і дае „падуладным“ народам магчымасьць усестароннага разьвіцьця, — павінен рашыць спорнае пытаньне аб тым, хто першы мае даць доказы сваей лёяльнасьці, як раз наадварот...

І зусім правільна паступіў пасол Тарашкевіч, калі ён, з пункту гледжаньня гэтага навачаснага разуменьня гаспадарства, як средства, а не самамэты, заявіў, што адказ Польскай дзяржавы ад свае настаяшчай ролі і законных абавязкаў адносна да беларускага народу, звальняе са стыхійнай сілай яго ад тых абавязкаў лёяльнасьці, якія ад яго імені выдалі ў Польскім Сойме прадстаўнікі гэтага народу.

Як ведама, гэтае мейсца прамовы п. Тарашкевіча—аб абавязковай „санкцыі“ з боку высшай чым дзяржава інстанцыі — з боку народу — ў выпадку нарушэньня дзяржавай свайго абавязку перад ім, выклікала найболей перасудаў і было вытлумачана зусім навыварат тымі элементамі польскага грамадзянства, якія як раз зьяўляюцца найбалей яркімі і пасьледовальнымі прыхільнікамі старога, зданага ўсюды ў архіў паняцьця гаспадарства, як „прыроднага гаспадара“, ўладаючага тэрыторыямі і народамі на правох поўнай і бязумоўнай уласнасьці,— „bez warunków i zastrzeżeń“...

Гэтай грознай цытаты з польскай нацыянальнай песьні аб „dymie pożarów i kurzu krwi bratniej“, якая напамінае вядомую пагрозу Герцэнштэйна „ілюмінацыямі“ ў першай Думе,—Тарашкевічу доўга ня даруюць польскія Дубровіны і Марковы II...

Праўда гэткіх „Герцэнштейнаў“ цяпер шмат і на апазыцыйнай правіцы і напр. „Gazeta Warszawska“ трэба думаць у пераканаьні піша, што „калі земляўласьнікі не зразумеюць патрэбнасьці ахвяр, якіх ад іх вымагаюць, дык ім награжае „nieobliczalna w swych następstwach zawierucha społeczna“... г. ё. той-же самы „дым пажараў“, аб якім гаварыў пасол Тарашкевіч.

Як бачым, сам пракурор—абвінівіцель п. Тарашкевіча — зьяўляецца ня дрэнным праступнікам...

У кожным выпадку гэта даказывае толькі правільнасьць і магутную сілу ўсучаснай грамадзкай сьвядомасьці Польшчы новай рэспубліканскай ідэі гаспадарства...

Яшчэ прасьцей выказваюцца pro domo sua на польскай левіцы.

Даволі прыпомніць любую адозву P. P. S., а асабліва энэргічную адозву

ў часе леташняга крызысу, калі, як і цяпер, Польшчы награжала міністэрства Карфантага,—з прызывам да актыўнай барацьбы з правіцай на вуліцах і плацах за свае ідэалы.

Можна тут успомніць і вядомую пагрозу самога Начльніка Дзяржавы з эпохі таго-жа крызыса—„zdjąć mundur, wyjść na ulicę, przemówić do tłumów językiem tłumów"... так „żeby kości zatrzeszczały" у ненавіснай правіцы...

Заслугай Клюбу зьяўляецца ўва ўсякім выпадку правільная пастаноўка гэтага аснаўнога пытаньня.

Дэмакратычнае грамадзянства ня ведае і не прызнае ніякай *бязумоўнай* „лёяльнасьці" адносна да гаспадарства, а ставіць апошняму акрэсьленыя варункі, альбо само робіць яго па сваёму пляну.

Беларускі народ праз вусны свайго Клюбу наставіў гэтыя варункі Польскай дзяржаве.

Ен патрэбаваў ад уключыўшай у свае межы белрускі народ Польшчы волі т. ё. грамадзкай свабоды, законнасьці, раўнапраўя,—зямлі і школы.

На дамаганьне волі польская ўлада адказала масавымі рэпрэсыямі і „ліквідацыйнымі" працэсамі, якія па сутнасьці можна прыраўнаць да свайга роду „помсты" найбалей актыўным працаўнікам мінуўшай выбарнай кампаніі, рэпрэсыямі, якія задоўга перад гэтым, ў часе выбараў былі прадсказаны усюды прадстаўнікамі мясцовай паліцэйскай улады, гэтым самым робячы з запросін Польскай Рэспублікі сваіх грамадзян да выпаўненьня іх грамадзкага абавязку нячуваную, грандыёзную па маштабу правакацыю...

На дамаганьне зямлі польская ўлада і польскі Сойм аднагалосна адказалі прызнаньнем вялізарных крэдытаў на асадніцтва, а падгатаўляемая новая „польская большасьць" у Сойме адкажа, як трэба чакаць, напэўна, такой „новэлізацыяй" зямельнай рэформы, пасля якой беларускай зямлі для хлебароба-беларуса застанецца бадай яшчэ менш, як уласнай польскай зямлі для безьзямельнага польскага селяніна.

На дамаганьне асьветы, школы на роднай мове „przyrodzony gospodarz Państwa Polskiego" адказаў нэдзнай падачкай і далейшай паланізацыяй беларускіх дзетак, астаўленьнем у нетыкальнасьці сыстэмы рэпрэсый адносна да ствараемых з такімі труднасьцямі, на ўласныя крывавыя грошы беларускай нацыянальнай школы...

Вось той адказ, які наагул атрымалі на выказаную імі сваю лёяльнасьць беларускія паслы ад вымагаючага ад іх павялічанай лёяльнасьці Польскай Дзяржавы.

Работніцкая культура.

28 красавіка ў залі Польскага Рабочага Дому рэдактарам „Kultury Robotniczej" Я. Гэмпэлем была прачытана лекцыя на тэму „Работніцкая культура".

Як 2000 гадоў таму назад, так і цяпер людзкасьць знаходзіцца на ўзьмежжы дзьвюх культур: аджываючай старай культуры прывілеяваных вярхоў і нараджаючайся новай культуры працоўных масаў. Шмат хто скажа, што ня можа быць мовы аб культуры аддзельных клясаў наогул і аб работніцкай культуры часткова; істнуе толькі адна агульналюдзкая культура, і можна гаварыць толькі аб папулярызацыі гэтай культуры, каб зрабіць яе дастулнай шырокім працоўным масам.

Але гэта ня так. Кожная эпоха носіць у сабе ахварбоўку ідэй тэй клясы, якая мае пераважны ўплыў на тварэньне данай культуры. Культура эпохі, якая прышла на зьмену старажытнай культуры паганскага сьвету разьвівалася ўвесь час пад уплывам ідэй хрыстыанізму і дзеля гэтага зусім слушна носіць назову хрысьціянскай, хоць ніхто ня будзе пярэчыць, што ў тварэньні яе прыймалі ўдзел і іншыя - зусім не хрысьціянскія—чыньнікі. Так сама і нараджаючаяся культура мае ў сабе ахварбоўку паняцьцяў работнікай клясы. пад пераважным уплывам якой яна творыцца.

Істнавала значная рожніца паміж старадаўнай культурай, пахаванай на руінах Рымскай Імпэрыі і хрысьціянскім сярэднявеччам, як у панаваньні тых ці іншых ідэй, так і ў укладзе грамадзкага і палітычнага жыцьця; але калі параўнаць сыстэму прадукцыі тэй і другой эпохі, дык рожніцы ніякай мы тут ня знойдзем: тая самая сыстэма ручной працы; паступова паляпшаліся прылады прадукцыі, мог работнік знайсьці тыя ці іншыя лепшыя спосабы працы, удасканаліць некаторыя дэталі, але па сутнасьці ўсё аставалася пастарому, панавала сыстэма дробна-рэмесьленае прадукцыі. У земляробстве-ж ня толькі ніякага поступу мы ня бачым, але наадварот — істнуюць доказы, што аграрная культура старажытнай эпохі стаяла шмат вышэй, чым у зьмяніўшай яе эпохі хрысьціянскай культуры.

Аканчальны пераварот у сыстэме прадукцыі зрабіла машына. Машына ня толькі скарочывае і аблягчае людзкую працу, ня толькі павялічывае ў шмат разоў прадукцыю і удасканаляе якасьць яе, але творыць шмат рэчаў, якія ніколі не маглі-бы быць створаны без яе; так напр. многія сучасныя скамплікаваныя машыны ні ў якім выпадку ня могуць быць зроблены беспасрэдна рукамі чалавека, каб не істнавалі другія прасьцейшыя машыны. Такім чынам машына адкрывае перад намі новыя магчымасьці, якія ніколі і на сьніліся папярэднім пакаленьням.

Каб тварыць культурныя вартасьці чалавек мусіць мець забесьпячэньне свайго істнаваньня—на яго мусяць працаваць іншыя, і ўвесь працэс тварэньня культуры папярэдніх эпох можна параўняць з возам, на якім едзе кучка людзей і кіруе ім, а ўся рэшта люднасьці прымушана цягнуць яго.

Машына адкрывае перад намі новыя пэрспэктывы: дае магчымасьць усім ехац на самаходзе, цягнуць якога нікому ня трэба.

Культура прывілеяваных у сілу неабходнасьці становіцца культурай паразытаў і мае на мэці вызыск. Калі напр. у старадаўным Эгіпце абавязкова была натрэбна веда аб часе разьліву Ніла і урэгуляваньні запасаў валы дзеля першараднага значэньня гэтага зьявішча для ўсей люднасьці краіны, мусела істнаваць група людзей, якой патрэбна было сцэцыяльна заняцца гэтымі пытаньнямі, а гэтай групай і была каста жрэцоў. Абладаючы гэтаю ведаю і трымаючы тым самым у сваіх руках лёс усей краіны, жрэцы не маглі ня вызысківаць гэ-

Адстаўка Ластоўскага

Як паведамляюць Ковенскія газэты, Вацлаў Ластоўскі-старшыня Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі падаўся у адстаўку. Заместа Ураду Ластоўскага утворана Беларуская Дзяржаўная Камісія, на чале якой стаіць Петра Крычэўскі, - старшыня Рады Бел. Нар. Рэспублікі. Палітычную акцыю у Каленіі прыняў А. Цьвікевіч.

XII канфэрэнцыя Камуністычнай партыі Беларусі.

На адбыўшайся ў Менску XII канфэрэнцыі камуністычнай партыі Беларусі аднагалосна ухвалены даклад і тэзысы Чарвякова па нацыянальнаму пытаньню. Прыняты гэткія пастановы: павялічыць тэрыторую Савецкай Беларус, якая цяпер складаецца з 6 паветай Менскай губ. праз далучэньне ў як найхутчэйшым часе Вітебскай і Гомельскай губ., а ў далейшым часе прадбачыцца далучэньне так сама Смаленскай і Бранскай губ, якія зьяўляюцца бязумоўна аднароднымі з этнаграфічнага боку; але гэтае аб'еднаньне прадыктована інтарэсамі эканомікі, інтарэсамі вырабчасьці, інтарэсамі разьвіцьця гэтай вырабчасьці, аб патрэбнасьці дзеля смычкі рабочага і селяніна вясьці на вёсцы агітацыйную, культурна-асьветную працу ў беларускай мове; аб патрэбнасьці ужываць у Савецкіх установах мяйсцовыя мовы; аб павялічэньні папулярна-навуковай і марксіцкай літэратуры галоўным чынам на беларускай мове; аб рашучай барацьбе з дробна-буржуазнымі шавіністычна-нацыянальнымі ўплывамі і вяліка-дзяржаўнымі перажыткамі. Гаворачы аб школах Чарвякоў адзначыў патрэбнасьць высокай ацэнкі матчынай мовы.

Апрача таго ухвалены прапазыцыі аб аказаньні падтрыманьня буйнай прамысловасьці, ўвядзеньні адзінага налогу і пераходу яго з натуральнага на грашовы і аб'еднаньні на вёсцы ўсіх спажывецкіх і сельска-гаспадарчых каапэратываў.

Уяўленьне.

Пасьвячаецца Леапольду Родзевічу.

I.

Радасьць мая вялікодная
Сына, пазнаўшага Маць.
Песьняй прадвесьня лагоднаю
Ўсіх я пачну абдараць.

Знаю—крыніцы гаючыя
Ёсьць на радзімай зямлі.
Дальлю захоплен бліскучаю,
Выслаў ён дум караблі.

Брацьці, зраблю вас багатымі,
Зорамі высаджу край.
Сонцам зазьзяе над хатамі
Словаў маіх каравай.

Сэрцы пратну зараніцаю
Новых надходзячых дзён;
Выпішу сказ бліскавіцаю,
Выяўлю дзедаўскі сон.

Гэй, гаруны, і бядулі, і сумныя,
Ваш гэта чуецца плач?
Годзі! бяседа ў нас шумная,
Ў хаце сялянскай багач!

Змрок заняпаду кудзеляю,
Выпрадзе ўвесь яго сьвіт.
Будзьма вясёлымі: бель Яе
Неба аздобіць блакіт!

II.

Заправды,
Радасьць—рацыя:—
Бацькаўшчына Беларусь
Ёсьць
Наймалодшая Нацыя.
З будняў блядых
Чорная косьць
Разьдзьмухала Рух
Стараны
Вёсак і сёлаў.
Пяруны завірух
Ўзахапленьні
Грымяць аб адным:—
Паўнагучна Адраджэньне!
Бачу за ім
Бязьмерныя далі
І
Вялікія вартасьці.
Божа! ў сьведкі:
Мужычы голаў
Знаны ўпартасьцю
Разбух.
Абрадзініцца ён
Новых дзён
Папарацьць—кветкай.

III.

А было пагана як:—
Ветры дзьмулі лютыя,
Спалі паслухмяныя
Вёскі, сьцюжай скутыя.

Горш былі за ворагаў
Ёй сыночкі родныя—
Ждалі скону скорага
І сьлязы ні воднае.

Але што да гэтага
Мне ад руху п'янаму?
Чую сьпеў няпетага,
Музыку нязнанаму.

Вінныя, віну ўшчыню.
Я ні ў чым ня каюся,—
Нябыцьця мінуўшчыны
Тройчы раз зракаюся!

IV.

Між пушчаў,
Ў гушчах
Лясоў,
Ў балотах
Ад слоты
Бяз слоў,
Бяз рыс
Выразных твару,
Бяз жару
Ў сэрцах—горнах,
Пакорна,
Як хмыз
Ці гной
Чужога поля,
Гібеў, як стой,
Ў бязвольлі,
Ў няволі,
Ў нядолі,
Мой люд.
І кожны тут,
Сусед наш ласы,
Нагадваў з часам
Мець дзель.
Але наш Дух,
Даючы рух,
Жыцьцё,
Праз крыўду, зьдзекі
І забыцьцё,
З прадвеку,
8 гадоў старых,
Быў захаваны.
І вось—нязнаны—
Сягнуў тварыць.
І з першых дзён
Змог сну палон
І ночы глуш.
Мужычых душ
Зьявіў красу
І бель.

V.

Мячы маланак пелі
Ĭ навальніцы йшлі,
І гром вясьняны хмелем
Паіў абшар зямлі.

А вечарамі ў неба
Хтосьць пеўня вынускаў
І аб штодзенным хлебе
Там праўды ён шукаў.

І да глухой паўночы
Вылізваў цемнату.
Сачылі з верай вочы
Пажараў яснату.

Ды „Пяты" коўдрай чорнай
Прыкрыла ноч сама,
Каб зноў былі пакорны,
Каб зноў... Але дарма!

Дзірван ўзрылі буры
Шматкамі жорсткіх слоў:—
Чакаюць вёскі—Юры
З вясною прыйдзе зноў.

VI.

Нашая ніва.
Сейбіт зары
Сее маўкліва
Сум аб дабры.

Жменяю семя,
Дужы узмах.
Ў золаку дрэме
Сонечны шлях.

Дзевы - дзянніцы
Кленчаць на ўсход.
Ў кроплях расіцы
Буйны ўмалот.

Ўсюды прароцтвы...
Хто-ж іх пайме?
Розум—убожства
Верыць зіме.

Вецер сьлязьліва
Ўторыць яму;
Лозы жахліва
Вяжуць думу.

Толькі-ж бяз меры
Сьлёзы чаму?
Хто ў зьняверы
Плача на цьму?—

тай веды на сваю карысьць і, каб яшчэ больш мець уплыў на цёмныя масы, сеялі лягэнды аб паходжэньні іх веды ад істотаў наднатуральных—багоў. Так сама справа стаяла і ў пазьнейшую эпоху. Ведай магла карыстацца нялічная група людзей, якая, каб захаваць сваё карыснае палажэньне, заўсёды старалася забраніравацца, стварыць замкнутую касту, ў якую дапушчаліся толькі пасьвяшчоныя, даўшыя абет не здрадзіць сакрэтаў касты. Тыпічным прадстаўнікам гэтага зьяўляюцца жрэчэскія касты ўсіх краёў і эпох.

Так сама справа стаіць і цяпер, калі веду могуць здабываць толькі адзінкі, належачыя да пануючай клясы. Рожніца можа толькі ў *большай замаскаванасьці* гэтага зьявішча. Могуць зрабіць закід, што цяпер веда адкрыта для ўсіх; для кожнага, хто мае жаданьне і здольнасьці—да якой-бы ён сацыяльнай клясы не належаў—дзьверы храму навукі шырака раскрыты. Але гэта толькі так здаецца. Паміма таго, што каб атрымаць навуку патрэбны вялікія матэрыяльныя срэдствы і дзеля гэтага карыстацца з яе могуць толькі дзеці пануючых клясаў,—уся сучасная сыстэма выкладаньня навукі уложана так, каб затрудніць доступ да яе храму шырокім працоўным масам. Штучна павялічываецца час трываньня навукі, ўводзячы для гэтага выкладаньне шмат непатрэбных рэчаў, як выкладаньне памёршых моваў. 9/10 гісторыі літэратуры, створанай пануючымі клясамі для забавы і прыемнасьці, выцякаючай ня з крыніц творчай працы,—рэч зусім непатрэбная.

Адсутнасьць бесперарыўнай сувязі паміж тыпамі школаў так сама служыць для гэтай мэты. Пачатковая школа, якая пераважна ўтворана для працоўнай незаможнай клясы, дае сурогат веды. Апрача таго школа мае на мэці *ураблянньне поглядаў на сацыяльны уклад*. І калі адзінка, вышаўшая з работніцкай прыгнечанай клясы, пройдзе сучасную школу аж да вяршын цяперашняй навукі, дык яна настолькі пранікнецца ідэолёгіяй пануючай культуры, што сама становіцца ў рады вызыскуючай клясы і бароніць яе прывілеяванае палажэньне.

Гэтая рыса—*маскаванага вызыску*—ёсьць характэрнай для т. зв. дэмакратычнага ладу ўсіх часаў.

Возьмем Афіны—гэты цэнтр антычнай культуры, ў якім панаваў дэмакратычны лад і раўнапраўе грамадзян. І вось мы бачым, што гэтая пышная культура вырасла на вызыску сваіх паднявольных бясправных рабоў і люднасьці тых краін, якія былі ў тэй ці іншай залежнасьці ад Афін. Тое самае можна сказаць і аб Рыме, і аб кожнай сучаснай дэмакратычнай вялікай дзяржаве. Дабрабыт і культура Англіі, якую так часта ставяць за прыклад запраўднай дэмакратычнасьці, ладу і парадку, будуецца на вызыску вялізарных калёній. Нават стасункова лепшае становішча рабочых такіх мэтрополій мае падставай яшчэ большы вызыск людзнасьці паднявольных краёў —і дае ім магчымасьць выйсьці з клясы эксплёатуемых і самым стаць эксплёататарамі,—вось чым тлумачацца угадовыя настроі і малая рэвалюцыйнасьць рабочых пануючых нацый.

Культура кучкі прывілеяваных, паразітуючых шырокія масы, стараецца разьбіць салідарнасьць інтарэсаў працоўных мас і не дапусьціць іх да веды. Для гэтага істнуюць спэцыяльна прыдуманыя лягэнды, як лягэнда аб Зьмею-Спакусіцелю, што зманіў першых людзей абяцанкай даць веду, якая зрабіла-б іх роўнымі багам і якую кару атрымалі яны за гэтае жаданьне; ці зноў лягэнда аб Вавілонскай вежы, дзе салідарная праца людзей магла дапяць паднябесных высяў, гэта не падабалася таму, хто панаваў у гэтых высях і, каб перашкодзіць супольнай згоднай працы, разьбіць салідарнасьць людзкую — памяшаў мовы, ствараючы грунт для агульнага неразуменьня.

Але дзякуючы новай сыстэме арганізацыі працы адкрываецца магчынасьць зьдзейсьніцца адвечнаму ідэалу аб роўнасьці людзей, аб роўным карыстаньні ўсімі людзьмі здабыткамі культуры, Ужо і цяпер на сучасным ураўні прамысловай тэхнікі ёсьць магчымасьць забясьпечыць усе патрэбнасьці людзкасьці. Прычына таго, што істнуюць прамысловыя крызысы, істнуе недахват прадуктаў ляжыць у няголнасьці капіталістычнай сістэмы арганізацыі прадукцыі і няудольнасьці ў арганізацыі падзелу прадуктаў.

Мы часта чуем цяпер, што істнуе надпрадукцыя тавараў, якая выклікае прамысловыя крызысы і безрабоцьце. Сьмешна казаць аб надпрадукцыі ў тэкстыльнай прамысловасьці ў той час, калі шмат мільёнаў людзей ня маюць у што адзецца і ходзяць абарванымі, ці аб надпрадукцыі хлеба дзе-небудзь у Амэрыцы, калі ў шмат якіх краёх працоўныя масы жывуць паўгалоднымі, а то і проста паміраюць з голаду.

Калі-б затраціць столькі працы, колькі цяпер ідзе на вааружэньне капіталістычных дзяржаў на павялічэньне, скажам, прадукцыі зямлі, дык можна сьмела сказаць, што галодных на зямлі-б ня было.

Цяпер павінен прыйсьці культ творчай працы. Работніцкая кляса, якая ў сучасны момант адыгрывае ўжо вялікую ролю ў жыцьці людзкасьці і пад знакам якой будзе тварыцца новая культура, ўвядзе гэты культ працы, якая дагэтуль пры сьвеце буржуазнай культуры была ў пагардзе. Вазьмеце Біблію—гэтую падставу аджываючай культуры—і вы там знойдзеце ўсюды пагляд на працу, як на кару, пракляцьце за грахі людзкія,

Работніцкая культура нясе пашану да працы. Чалавек мусіць тварыць сьвет і мусіць мець жаданьне творчай працы.

Начынаецца новая эпоха, дрыжаць устоі старага сьвету, і ён хутка распадзецца. Многія ў пярэпудзе думаюць, што ўсё гіне, сьвет канчаецца. Не, канчаецца і гіне толькі стары аджыўшы ўклад, а на яго руінах паўстае новы, родзіцца новая культура,—культура будаваньня сьвету, культура радаснага тварэньня сьвету.

Я. Л—віч.

Пісьмы з Сэрбіі.

Досіцей Обрадовіч.

Першым і вялікім сэрбскім пісьменьнікам лічыцца Дзімітры Обрадовіч, у калуджерству (манашаству) Досіцей Обрадовіч. Радзіўся ён ў адным сэрбска-румынскім сяле ў Тамішском Банату і напэўна ня ведама ці ў 1742, ці ў 1743 гг.

Досіцей Обрадовіч і яго праца на карысьць роднага народу варты таго, каб пра яго сказаць некалькі слоў, але ня ў кароткай заметцы з чужыны. Ды можа я-б і прамаўчаў, каб надта цікавы факт з жыцьця Обрадовіча не крануў маю беларускую душу.

У сэрбскай гісторыі літэратуры ёсьць заўважана, што ў пачатку 1785 г. Досіцей Обрадовіч адтрымаў пісьмо ад Сымона Зорыча, генэрала маскоўскай службы і сэрба па ўраджэньню. Зорыч тады жыў на Беларусі ў Шклове, думаў там адчыніць ваенную школу і запрашаў Обрадовіча за вучыцеля. Обрадовіч ня згадзіўся і галоўным чынам гэтаму была прычына недахват грошы. Але ўсё-ж ў канцы 1787 г. Обрадовіч паехаў ў Шклоў і ня выкладаць навукі, як жадаў і спадзяваўся Зоріч, але збудаваць там друкарню, у якой хацеў друкаваць свае творы і творы іншых славянскіх пісьменьнікаў.

Як відаць, друкарня мелася быць чыста славянская.

Зорыч з вялікай ахвотай обяцаў найсьці на сустрэч жаданьню Обрадовіча, сам зацікавіўся друкарняю і Зорычу, як багатаму чалавеку, прыходзілася верыць. Але прайшло 6 месяцаў, Зорыч больш гаварыў, чым прапаваў ў справе друкарні і Обрадовіч, чалавек доражыўшы кожнай гадзінай махнуў рукой на друкарню і ў чэрвені 1788 г. Обрадовіч пакінуў Беларусь.

Так неспадзейна сканала цікавая і вельмі карысная мэта вялікага сэрба.

М. Запольскі.

З усяе Беларусі.

Пружанскі павет.

Шчасьлівы наш інспектар школьны п. Алезаўскі. Бо па другіх паветах, дык хоць у газэце з большага „прапішуць“ за іх дзейнасьць. Але ў нас ніхто і не думаець. Прычына маўчаньня тая, што сяляне нашага павету надта ўжо напуджаныя тутэйшай адміністрацыяй. Гэта адміністрацыя умее так трымаць нашага „мужычка“ у „яжовых“ рукавіцах, што ён ані „пісьнець“.

Хачу пару слоў сказаць аб тых вучыцялёх, якія наплываюць з Галіцыі і Крулеўства да нас, як саранча, аб тым, як школьны інспэктар прымаець вучыцялёў—белар. на пасады і аб адносінах інспэктара да беларускіх школ.

Вучыцялі, якія прыежджаюць з Галіччыны і Крулеўства на нашую Бацькаўшчыну дзеля „прасьвяшчэньня“ нашых дзетак, большая частка саўсім мала-граматныя. Скончыўшы якуюсь там „повшэхную“ школу, едуць на kresy на пасаду вучыцеля Бо ведама, там такіх „анальфабэтаў“ прыняць на якую бы то ні было пасаду ня могуць, а на kresach, дык і гэткае дабро знайходзіць мейсца. Кажды дзень прыежджаюць усе новыя і новыя дабрадзеі і ўсе маюць мейсца. У каждой вёсцы сядзіць гэтых „культуртрэгераў“ па 2—3. Што яны ў гэтых белар. вёсках робяць? А вось што: вучаць польскія малітвы і вершы польскага патрыятычнага зьместу. Гісторыя выкладаецца ў саўсім неадпаведным для нашага часу, духу.

У расійскіх школах беларускія дзеткі, чытаючы аб беларусах і іх краі ня ведалі, дзе яны жывуць і што робяць, так і цяпер тое самае. То была царская дэспотычная Расея, а цяпер — дэмократычная Польшча... Вялікая розьніца! Апрача малітваў і патрыятычных польскіх вершаў, дык гэтыя „вучыцялі“ балей нічога і ня вучаць? Як-жа яны будуць вучыць, калі самі нічога ня ўмеюць? Яскравым фактам можа служыць тое, што ў 21 годзе ў вёсцы Д. вучань 3-го аддзяленьня на

Мудрасьцю сівы,
Сейбіт зары
Сее на нівы
Сум аб дабры.

Ўзыдуць зярняты
Ліху канец.
Весткі крылатай
Жду—пасланец.

VII.

Песьняў, песьняў, скочных чынаў:
Выцьвіў ночы аксаміт!
Перад скрыняй будучыны
Я - юнак Давыд.

Сэрцам верным
Сею мерна
Вешчы вершаў мак.
Над табой, Сыоне родны,
Перад сьвітам зоры згодна
Сталі ў тайны знак.
І сьвятлей за крыж
Ён адзначыў выш.
Хай жа Божа
Дапаможа!..

VIII.

Сьняжок на прадвесьні
Вуркоча, бяжыць
Зацьвіўшае плесьняй
Ня здолее жыць.

Дарма свае сілы
Зьбірае зіма, —
У друзгах ня міла
„Народаў турма“.

Пракляцьце „Расея“
Прапала на век.
Ня страшыць завея
Бліскучых павек.

К трывогам зьняважа,
Разьдзёрта імгла
І творчасьці смага
Агнём праняла.

Шырокаю тропай
Ў час гэты з пакус
На мапу Эўропы
Ўзыйшоў Беларус.

У лапцях лазовых
Па сьвітцы ручнік
І сьветам Хрыстовым
Зіяе аблік.

IX.

Нябескіх трамаў
Зьвісае край:—
Віхура браму
Зламаў у рай.

О, Божа, позьні
Твой голас слаб:
На райскай пожні
Ў сярмязе раб.

Зьбірае зораў
Гарох ў палу,
Каб імі гора
Гаціць імглу.

Ў крывіцкіх вёсках
Ўзьняўся гуд,
І ў адгалосках
Зрастае цуд:
Гаўядзе нашай
Сыцець чарод:
Буяе паша
Маіх балот.

X.

Ой, ня белыя галубы
Раніцою ранелька
Ў блакіт шыбалі.
—Чаго рады быў?
Ці запраўды далі
Вабілі ясьненька?
Не драпежныя крумкачы,
Не чарнюськая хмара,
Нам нанесла гора—
Вамі Крывічы
Заваладаў вораг,
Насьмяяўся з мараў!..

XI.

Ноччу, ах, ноччу
Хтосьці тапоча!
Голас прарочы...
„Ганьба, о, ганьба над намі,
Сорам сябруе з сынамі.
Ныюць так раны.
Сьлёзным туманам
Засьцяцца вочы.
Ні праўды сьвятое
Ні волі тое.
Чужынцы, напасьці,
Пакута падзелам.
Па беламу целу
Знаком ад нажа
Крывавіць мяжа.
І кажуць прапасьці...
Толькі—не,
Не пазбыць...
Ня міне
Чаму быць!..

Мой дух не парух,
Не пагас праз вякі,
Паходняю сьвеціць
Пад хмараў павецьцю,
Гарыць і іскрыцца
Агнём бліскавіцай.
На родных узлоньнях
Натхненная сіла
Мазольных далоняў
Разьбіла, зьнішчыла
Ярма ланцугі;
Спаліла, скрышыла
Ўрокі благіх.
. . . .
Выходзяць дзяучаты
Выгукваць вясну...
Я славу вам, хаты,
На дзідзе вярну!
Голас яе...
Бурай пяе...

Я-ж вачэй ня узьніму багавіца,
Толькі ўзрушаны думкі чамусь...
О, як салодка сэрцу маліцца:—
Беларусь, Беларусь, Беларусь!

XII.

Народы! прадбачу:
Шпаркасьць коняў
Пагоні
Суліць удачу.
Вам на пасадзе
Пакутніцу
Нявехнай бачыць.
З доляй—закутніцай
Ўладзе,
З ясным абліччам,
З глуму, з нягодаў,
Слову заручана,
Кліча
Да брацтва, згоды.
Раны змучанай,
Дым пажараў
—Ахвяра
За вашу злачыннасьць
Народы.
Ды ведайце толькі:
Ёй
Над „сёньня“ золкім,
Будучына
Квяцістай пуцінай
Сьцеле вясёлкі.

Уладзімер Жылка.

1922 г.

арытмэтычным прыкладзе вучыцельку загнаў у „казіны рог“... Не магла рашыць прыкладу, які рашыў вучань! Гэта вучыцелька і цяпеь вучыць. Аднак з вёскі Д застала пераведзена ў другую. Бо сорамна было аставацца...

Другая вучыцелька гаварыла так: ja nie znam ułamków zwyczajnych, bo u nas, w seminarjum nauczycielskiem tego nie uczą“(!) Няведаю, што там за сэмінарыя? І гдзе яна істнуе з гэткай праграмай? П. інспэктар не зважае на гэта. Толькі тым і канчаецца, што пераносіць з адной вёскі ў другую. І пан інспэктар прымаець такіх людзей на так важныя пасады, ня робячы ніякіх перашкод. Ім не дзяцей вучыць, а самым яшчэ вучыцца.

А старыя вучыцялі беларусы, якія ўжо працуюць на пэдагагічнай ніве дзесяткі гадоў, мусяць ісьці жабраваць, альбо біць каменьня, бо для іх „posad wolnych niema“. Гэтымі славамі пан школьны інспэктар ў леташнім годзе адмовіў вучыцялю-беларусу Матэльскаму, а нядаўна адмовіў другому, не зважаючы на тое, што астатні падаваў просьбу некалькі разоў.

Што да беларускае школы, дык п інспэктар глядзіць на яе, як сабака на ката. Хутчэй на расейскую школу згадзіўся-б ён, чым на беларускую. Напрыклад, у леташнім годзе, сяляне вёскі Ліхачоў, Котранской вол. напісалі прыгавар аб адчыненьні ў іх вёсцы бел. пач. школы. Прыехаўшы ў Ліхачы, ён сабраў усіх гаспадароў гэтай вёскі і пачаў нагаварываць іх, што-б яны адмовіліся ад беларускае школы.

Нагаварываць, дык няхай нагаварываў-бы, бо ён на гэта пастаўлены, але гістарычныя факты перакручываюць, як ён рабіў, то гэта недастойна і сорамна перад людзьмі. Гаварыць сялянам, што быццам тут беларусаў ніколі ня было і няма(!) што мова „тутэйшых“ — польская, але троха сапсутая(!!), што край гэты быў і ёсьць чыста польскі(!!!) —гэта адпаведае становішчу толькі агітатара, ані чалавека, якому даручана народная прасьвета.

Пан інспэктар зусім ня лічыцца ні з гістарычнымі фактамі, ні з вымаганьнямі пэдагогікі, якая кажа, што дзяцей трэба вучыць у роднай зразумелай для іх мове; ня лічыцца нават з артыкуламі польскай канстытуцыі, якая дае нацыянальным меншасьцям права мець сваю родную школу. Для яго гэта ня істнуе, ён мае на мэці толькo „dobro ojczyzny“, як ён разумее яго сваім недалёкім розумам.

Селянін.

1-га мая у Горадні.

Працоўныя масы Горадні урачыста сьвяткавалі 1-га мая 1923 г. Горадня даўно ня бачыла такога магутнага сьвята беднаты. У паходзе ўзяло удзел больш 3000 работнікаў з дзесяткамі чырвоных штандараў з рознымі лёзунгамі, як напр. „Далоў буржуазію!“, „Няхай жыве еднасьць працоўных мас!“, „Далоў вайну!“, „Няхай жыве сацыяльная рэвалюцыя!“ — надта напальхаў тых, хто жыве коштам другіх. А 10 гадз. ўсе работніцкія саюзы сабраліся на пляцы Баторага, скуль па галоўным вуліцам горада прышлі на Тэатральны пляц, дзе былі сказаны прамовы. Ад імені беларускага працоўнага сялянства і работнікаў выступіў з гарачай прамовай пасол Баран, які падкрэсьліў вялікае значэньне ў барацьбе за рабочыя ідэалы еднасьць сялянства і работнікаў. а так-жа ахарактарызаваў сучаснае становішча Польшчы і другіх капіталістычных дзяржаў, дзе ўзмагаецца рэакцыя і прызываў даць адпор зазнаўшымся эксплёататарам і ісьці далей шляхам клясавага змаганьня. Закончыў сваю прамову пасол Баран воклікам: „Няхай жыве 1 мая, як сымвал еднасьці працоўных мас! Няхай жыве ўлада мазалістай рукі селяніна і работніка!“

Пасьля гэтага паход, пяючы рэвалюцыйныя песьні, стаў разыходзіцца.

N.

Жыцьце школ Менскага пав.

Пры школах Менскага павету гуртуюцца школы па ліквідацыі няпісьменнасьці (шк. працаўнікі Сеньніцкае вол. пастанавілі распачаць ліквідацыю няпісьменнасці).

Драматычныя гурткі істнуюць пры большай палове школ павету. Школа ў Лапарэвічах, Заслаўскай вол. і ў Лысай-Гарэ, Беларуцкай вол., дзе, дзякуючы дзейнасьці шк. прац. гр. Сухога і Рымкевіча, гэтыя школы, *маючы прыбыткі ад пастаноўкі спэктаклю, прывялі у поўную забясьпеку.* Там куплены нестаючыя падручнікі, якімі Нар. Кам. Асьветы здаволіць ня мог, здабыты пісьменныя школьныя прылады і інш.

З беларускага жыцьця.

3-га траўня адбылося паседжаньне Беларускай Школьнай Рады; разглядалася справаздача са Зьезду пэдагогаў сярэдніх шлолаў: прыняты да ведама тэзы і рэзалюцыі зьезду; заслуханы і прыняты да ведама даклады: пасла Тарашкевіча аб палажэньні беларускіх пачатковых школаў і падгатоўцы вучыцялёў, гр. Трэпкі аб адміністрацыйным і фінансавым становішчы Вілен. Бел. Гімназіі; нарэшці адбыліся перавыбары дырэктара Вілен. Белар. Гімназіі, выбраны гр. А. Трэпка.

28 і 29 красавіка ў памешканьні Беларускага Грамадзянскага Сабраньня (Біскупская 12) адбыўся агульны сход сяброў сабраньня. Былі заслуханы даклады прэзыдыума Рады Старшынь і Рэвізійнай камісіі. Устаноўлена сяброўская складка па 5.000 марак у месяц. Зацьверджаны новыя сябры і бюджэт Сабраньня на бягучы год. Выбраны: Рада Старшынь у складзе Гапановіча, Г. Багдановіча, Канапацкага, Валэйшы, П. Біньдзюка, Самойлы, Арэхвы, С. Станкевіча, Счонсновіча, Маўрыда, Граніцкага і Кахановіча і кандыдатаў; Більдзюкевіча, Друцкага-Подберэскага, Протаса і Шылы; Рэвізыйная Камісія ў складзе Грыневіча, Кэпеля і І. Біньдзюка і кандыдатаў, Леўковіча і Знамероўскага.

12 траўня (ў Суботу) вучні 1-ае Віленскае Беларускае гімназіі ладзяць спектакль. Пастаўлена будзе пьеса Сучаснага „П. С. Х.“ і багаты дэвертысмент. Пасьля прадстаўленьня танцы да раніцы.

Чысты даход пойдзе на карысьць незаможных вучняў гімназіі.

Беларускі лес заграніцай.

У Дзьвінск (Латвія) прыбыла першая партыя 30 вагонаў лясного матэр'ялу з Польшчы.

Як паведамляе „Дан. Вест.“ усей у Польшчы лясной плошчы 9.035.000 гэктараў(8,267,025 дзесяцін) і з гэтага ліку на ўсходнія „крэсы“ прыпадае 3202500 дзесяцін лесу.

За адзін 1922 г. вывезена заграніцу з Польшчы 1320.000 тонаў ці 80.572.800 пудоў. Калі гэты вывезены лясны матэр'ял лічыць прапарцыянальна да лясной плошчы, дык з нашага краю за 1922 г, вывезена заграніцу прыблізна 22 230 000 пуд! Першае мейсца заграніцай па якасьці займае беларускі лес з Белавежскай пушчы.

Вечарына на карысьць незаможных вучняу Праваслаунэй Духоун. Сэмінарыі.

У аўторак 8 траўня ў залі Драматычнае Майстроўні (Вострабрамская 9) ладзіцца вечарына на карысьць незаможных вучняў Праваслаўнай Духоўн. Сэмінарыі. Прадстаўлена будзе „Модны Шляхцюк“ „Прыемны дзень“ і багаты дывэртысмэнт

Пасьля прадстаўленьня танцы на залі да 4 раніцы.

Адкрытае пісьмо да рэдакцыі газэты „Новае Жыцьце.“

Паважаны Грамдзянін Рэдактар! Не адмоўцеся зьмесьціць на старонках Вашае газэты ніжэй палажае:

Праца мая ў Амэрыцы сярод нашых беларусаў ідзець досыць значна. Нацыянальнае усьведамленьне нашае расьце. Аднак нагвалт патрэбен яшчэ чалавек, нацыяналіст - беларус, добры прамоўца, здольны як арганізатар, пажадана праваслаўны. А то аднаму мне не пад сілу, хоць, прызнацца, ужо сярод нашых эмігрантаў знайшліся добрыя памоцнікі ў працы,

Магу пахваліцца і падзяліцца сваёй радасьцю. У хуткім часе пачну падсылаць грошы для беларускіх нацыянальных арганізацый на культурную іх працу; сьпярша можа і не ў вялікім, а ў далейшым у больш значным разьмеры, бо зборы ахвяр даюць добрыя вынікі.

Прашу хутчэй паведаміць, на які банк у Вільні можна пераводзіць грошы і ці магчыма там выплата іх ў далярах, а роўна не адмоўцеся прыслаць мне акуратныя адрасы кожнае беларускае культурнае установы.

З пашанай *Антон Змагар.*

Да нашых чытачоу і падпісчыкау.

„Новае Жыцьцё“ адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

Сучасная ўсё ўзрастаючая дарагавізна стварае цяжк'я варункі для выданьня газэты. Ад грашовага падтрыманьня праз беларускае грамадзянства залежыць рэгулярны выхад нашай часопісі.

Рэгулярна ўнасіце падпіску і даплату.

Амэрыканскія беларусы неадкладна і рашуча павінны падтрымаць „Новае Жыцьцё“, каб не ўпаў беларускі сьцяг на беспатольнай Бацькаўшчыне.

Рэдакцыя і адміністрацыя.

З Горадні

Другі тыдзень як паўторна заарыштованы сэкрэтар Бел. Пасоль. Клюбу М. Якімовіч, якога абвінавачываюць быццам ён выдаў кагось бальшавікам у 1920 г.

Ужо 6 дзень як Якімовіч і др. аб'явілі галадоўку.

Усіх арыштаваных, якія сядзяць у вастрозе, 50 асоб.

Беларусы у Латвіі.

2-я Урадовая Беларуская Гімназія.

Люцын. 26 IV. 23.

Прыватная Гімназія Т-ва „Бацькаўшчына“ у Люцыву, па просьбе Школьнае Рады Гімназіі і Праўленьня Т-ва, перарабляецца з пачатку 1923/24 вучэбнага году ў Урадовую.

Дырэкторам Гімназіі, з 1-га красавіка 1923 гаду, назначаны былы Інспэктар Пачатковых Беларускіх Школ у Латвіі, гр. Канстанты Езавітаў.

Штандар Беларускім Скаутам.

Дзьвінск. 25. IV. 23.

Пры 1-й Беларускай Урадовай Дзьвінскай Гімназіі залажыўся Скаутскі Атрад, які працуе ўжо з восені.

23 красавіка, у дзень Св. Юрыя, пакравіцеля Скаутаў, прадстаўнікі Беларускага Атраду прынялі ўдзел у Агульна-Латвійскім Скаутскім Парадзе, які адбыўся у Рызе.

На гэтым парадзе Прэзыдэнт Латвійскай Рэспублікі перадаў Беларускаму Дзьвінскаму Атраду Скаутскі Штандар.

Штандар белы, з залатым шыцьцем, якім адзначаны № атраду (ва ўсеіатвійскім маштабе № 45), а таксама— гэрб скаутаў. У верхнім куту штандара зьмешчаны маленькі латвійскі флаг, а над ім нашыты шчыт беларускіх нацыянальных колераў, на якім вышыты блакітны васілек.

24 красавіка Штандар быў прывезены ў Дзьвінск і спатканы усім Атрадам на вакзале, затым ў 2 гадзіны таго-ж дня, штандар быў перанесены ў залю Гімназіі, дзе адбыўся кароткі скаутскі парад.

З прамовамі да скаутаў выступалі Кіраўнік Беларускага Аддзелу—С. П Сахараў, Дырэктар Дзьвінскай Беларускай Гімназіі—І. І. Краекоўскі і Дырэктор Люцынскай Гімназіі—К. Б. Езавітаў.

Свая пошта.

Ф. К. Слонім. Ваш верш ў нашу газэту не падыйшаў. Чакаем ад Вас карэспандэнцыі.

Кнігі прысланыя для рэцэнзіі.

1) *Тарас Гушча.* У Палескай глушы. Віленскае выдавецтва Б. А. Клецкіна.

2) *Ядвігін Ш.* Бярозка. 1923 Таго-ж выдавецтва.

3) *Х. Д. Якімчук.* Царина (думкі і пераживаньні) Выдавніцтво „Українска Хата“ Берлин.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня,** Віленская вул. 12 кв, 6.
2) **Ліда,** 11 Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.
3) **м. Глыбокае,** Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) **Жодзішні,** Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) **Навагрядак,** Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.
6) **Нясьвіж,** Альбянская 28, сскр. Ян Шнаркевіч.
7) **Столбцы.** Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.
8) **Баранавічы**
9) **Горадня.** Мастовая 9.
10) **Валкавыск,** Пясковая 14.
11) **Бельск,** Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.
12) **м. Саколка,** Горадзенская вул. 34.
13) **м. Клешчэлі,** Бельск. павету.
14) **м. Крынкі,** Горадзэнскага павету, Горадзенская вул. 34.
15) **Пружаны.** Вул. Дамброўскага 29.

Віленскае Выдавецтва Б. Клецкіна

Беларускі аддзел.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА:

1. **Максім Гарэцкій.** *Гісторыя Беларускае Літэратуры.* Выд. 2-ое, папраўленае. 208 стр. in 8°. Вільня. 1921.—9000 м.
2. **Арнадзь Смоліч.** *Географія Беларусі.* Выд. 2-ое, значна перароб-ленае і пашыранае:—22.000 м.
   Вып. 1. *Прырода Беларусі* (Фізычная Географія). Стр. 116+IV, in 8°. Вільня 1922.—7500 м.
   Вып. 2. *Насяленьне Беларусі і яго гаспадарная дзейнасьць. Паасобныя краіны Беларусі.* Стр. 117—367, in 8°. Вільня, 1922.—14.500 м.
3. Мэтрычная сыстэма мераў. Табліца 105×70 cm у 3 хварбах Вільня. 1922.—5.000 м.
4. **Максім Гарэцкі.** *Хрыстаматыя беларускае літэратуры. XI век—1905 год.* 264 стр., in 8°. Вільня. 1923.—15.000 м.
5. **Л. Гарэцкая.** *„Родны Край“*, другая пасьля лемантара кніга да чытаньня. Выданьне перарабленае і дапоўненае. Стр. 153, in 8°. Вільня. 1923.—9.000 м.

ДРУКУЮЦЦА:

6. **Б Тарашкевіч.** *Сінтаксіс беларускае мовы.*
7. **Тарас Гушча.** *У палескай глушы,* повесьць.
8. **Янка Купала.** *Шляхам жыцьця,* вершы.
9. **А Купрын.** *„Алеся“*, повесьць. Пераклад М. Косьцевіча.
10. **Арытмэтычны задачнік,** для пачатковых школ II частка.
11. **Язэп Нарцызау.** *„Вар'ят без вар'яцтва“*, Повесьць.

Глаўны склад выданьняў:

Wilno, ulica Mało-Stefańska, № 23.

ШКОЛАМ УСТУПКА

Рэдактар-выдавец Я. ЛАГІНОВІЧ.

Друкарня Дворжэца, Завальная 32